Каляга, А. У. Асаблівасці вывучэння ўліковай дакументацыі магнацкіх гаспадарак Беларусі канца XVI – першай паловы XVII ст. (на прыкладзе князёў Радзівілаў) / А. У.Каляга // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2/ Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 149–153.

**А. У. Каляга**

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ЎЛІКОВАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ МАГНАЦКІХ ГАСПАДАРАК БЕЛАРУСІ КАНЦА XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII ст. (НА ПРЫКЛАДЗЕ АРХІВА КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ)

Уліковая дакументацыя магнацкіх гаспадарак Беларусі канца XVI — першай паловы XVII ст. з‘яўляецца важнай крыніцай інфармацыі аб характары руху паступіўшых землеўладальніку грашовых сум і матэрыяльных каштоўнасцей (зерня, жывёлы і т. п.). Дакументы гэтай групы выступаюць у якасці аднаго са звёнаў пры вывучэнні эвалюцыі сучаснай бухгалтэрыі. Асобнае месца сярод іх займаюць «рэестры», «лічбы» і «сумарыушы» — своеасаблівыя зводныя ведамасці, у якіх змешчаны падрахункавыя паказчыкі па ўсіх галінах гаспадаркі магнатаў у грашовым і натуральным выражэнні. У гэтым артыкуле зроблена спроба крыніцазнаўчага аналізу ўліковых дакументаў, якія захоўваюцца ў фондзе Радзівілаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску.

Першым, хто па-сапраўднаму ацаніў навуковую каштоўнасць уліковай дакументацыі магнацкіх гаспадарак, былі вядомыя беларускія гісторыкі П. Р. Казлоўскі[1] і З. Ю. Капыскі[2]. У артыкулах П. Р. Казлоўскага асвятляецца гісторыя вывучэння крыніц гэтай разнавіднасці, праводзіцца класіфікацыя ўсяго комплексу гаспадарчых дакументаў, крытычна ацэньваецца іх інфармацыйны патэнцыял. Акрамя гэтага, Казлоўскі шырока выкарыстоўваў уліковыя дакументы, праводзячы комплекснае вывучэнне магнацкіх латыфундый Беларусі другой паловы XVIII ст.[3]

З. Ю. Капыскі засяродзіў увагу толькі на той частцы ўліковых дакументаў, дзе адлюстраваны рух грашовых сродкаў феадалаў.



Ён грунтоўна прааналізаваў прыходна-расходныя кнігі, падатковую і даўгавую дакументацыю феадальных гаспадарак XVI — першай паловы XVII ст. У даследванні Капыскага шырока выкарастаны архіўныя матэрыялы фонду Радзівілаў. Яго работа характарызуецца не толькі глыбокім веданнем крыніц, але і выкарыстаннем новай методыкі ацэнкі іх зместу. Гэта дало магчымасць Капыскаму сфармуляваць шэраг важных вывадаў. У прыватнасці, ён прыйшоў да перакanання ў неабходнасці больш шырокага выкарыстання гэтай групы крыніц пры аналізе стану тагачаснай эканомікі і яе асноўнага элемента — феадальнай гаспадаркі. Адным з недахопаў уліковай дакументацыі, на думку Капыскага, выступае яе фрагментарнасць, храналагічная і тэрытарыяльная абмежаванасць. Гэта зніжае яе значэнне для вывучэння дынамікі развіцця гаспадаркі феадалаў XVI — першай паловы XVII ст.

Станоўчыя прыклады навуковага выкарыстання ўліковай дакументацы вотчын, манастыроў,цэнтральных устаноў улады можна знайсці ў працах расійскіх гісторыкаў[4]. Іх намаганнямі была падрыхтавана публікацыя асобных гаспадарчых дакументаў манастыроў і часткі прыходна-расходных кніг маскоўскіх прыказаў.

На рубяжы XVI—XVII ст. ішоў працэс далейшага развіцця таварна-грашовых адносін на тэрыторыі Беларусі, павышэння рыначных сувязей паміж асобнымі яе рэгіёнамі, назіраўся рост таварнасці феадальнай гаспадаркі. Усе гэтыя фактары патрабавалі дакладнага ўліку вынікаў гаспадарчай дзейнасці феадалаў. Тым не менш першыя ўліковыя дакументы з’явіліся значна раней. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, інвентары і падатковыя матэтыялы сярэдзіны XVI ст., якія ўжо ведалі даволі складаную сістэму грашовых пабораў з сялян і гараджан на карысць дзяржавы і саміх феадалаў.

Тэрміны «рэестр», «лічба», «сумарыуш» выкарыстоўваліся для абазначэння розных відаў уліковай дакументацыі. Так, «рэестрамі» называліся гаспадарчыя дакументы, у якіх рэгістраваліся

вынікі папярэдніх рэвізій, якія праводзіліся па ўказанню феадала на працягу года. Адной з разнавіднасцей «рэестраў» з'яўляліся «veryfikacji» (у перакладзе з лацінскай мовы «пацвярджэнні»). Яны атрымалі распаўсюджанне, пачынаючы з першай паловы XVII ст. Прыкладна ў гэты ж час паралельна з тэрмінам «рэестр» пачалі ўжывацца тэрміны «лічба» і «сумарыуш». Яны выкарыстоўваліся для абазначэння дакументаў, у якіх фіксаваліся асноўныя паказчыкі штогадовага

**150**

ўліку і размеркавання феадаламі грашовых сродкаў, прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі.

Арганізацыя ўліку ва ўладаннях Радзівілаў у канцы XVI — першай палове XVII ст. і тэхніка састаўлення саміх дакументаў мелі наступны выгляд. Гаспадарчыя рэвізіі па распараджэнні адміністрацыі праводзіліся два разы ў год. Першая насіла прамежкавы характар і праводзілася пасля заканчэння восеньскіх сельскагаспадарчых работ. Зразумела, што галоўнай мэтай першага прыезду рэвізораў з'яўляўся дакладны ўлік колькасці сабранага ўраджаю. Пацвярджэннем гэтага можа служыць рэестр, складзены 22 верасня 1609 г. пры рэвізіі фальваркаў Жухавічы і Цэтра паверaным князя Радзівіла, які ў прыватнасці, паведамляў: «...злічыў копы і спісаў збожжа ўсялякае каторае з ласкі Божай зжата ў гэтым годзе»[5]. Захаваліся рэестры, якія больш падрабязна пералічваюць аб'екты абавязковага ўліку (акрамя збожжа і сена, «быдла ў аборы», «статак коней», «птушку хатнюю», «рэчы агародныя»). Кожны такі дакумент складаўся рэвізорам у двух экземплярах. Адзін передаваўся ў канцэлярыю магната, а другі, перапісаны «слова ад слова», захоўваўся, як правіла, у прадстаўніка феадальнай адміністрацыі (ураднікa, старасты) ці арандатара.

На падставе другой рэвізіі, якая праводзілася ў канцы года і адлюстроўвала вынікі развіцця ўсіх галін магнацкай гаспадаркі, складаліся лічбы і сумарыушы. У адрозненне ад рэестраў, якія з'яўляліся своеасаблівай формай бягучага ўліку, лічбы і сумарыушы выступалі ў якасці другасных бухгалтарскіх дакументаў.

Апошняя акалічнасць не магла не паўплываць на іх унутраную пабудову. У аснову ўліку быў пакладзены прынцып падзелу артыкулаў прыходнай і расходнай частак . Большасць лічбаў і сумарыушаў утрымліваюць наступныя часткі: 1) улік паступлення, і расходу грашовых сродкаў (чыншу) і натуральнага аброку (дзякла) з сялян; 2) прыход і расход зерня і агародных культур; 3) прыход і расход хатняй жывёлы. Зразумела, адхіленняў ад прыведзенай схемы было дастаткова, паколькі ў той час яшчэ не было ды і не магло быць аднастайных форм уліку. Таму ў гэтых дакументах, акрамя асноўнай, можна знайсці шмат ускоснай інфармацыі.

Складаліся лічбы і сумарыушы, як і рэестры, рэвізорамі, хаця маглі гэта рабіць і іншыя ўпаўнаважаныя асобы. Так, лічба двара Гарадзея за 1603 г. была першапачаткова састаўлена адміністратарам

**151**

уладання, а ужо потым апынулася ў руках княжацкага рэвізора, які, праверыўшы правільнасць праведзеных падлікаў, пакінуў на кожнай старонцы дакумента кароткі запіс «veryfik» («пацвярджаю»)[6].

У цэлым уліковыя дакументы заслугоўваюць даверу, паколькі прызначаліся для задавальнення патрэб феадалаў у дакладнай гаспадарчай інфармацыі. Аднак яны маглі ўтрымліваць і недакладнасці — выпадковыя ці наўмысныя. Так, у некаторых дакументах можна знайсці памылкі ў падліках, пропускі, закрэсленыя месцы. Гэта патрабуе дадатковага супастаўлення аднародных уліковых дакументаў, а ў шэрагу выпадкаў — паралельнага іх вывучэння з крыніцамі іншай разнавіднасці.

Асабліва цесная сувязь існуе паміж тагачаснай бухгалтарскай дакументацыяй і інвентарамі. Гэта пацвярджае, напрыклад, загаловак («Сумарыуш выбераня грошаў даходных... у інвентары апісаных...») аднаго з уліковых дакументаў фальварка Быстрыца за 1631 г.[7] Больш таго, трэба ўлічваць, што грашовыя і натуральныя выплаты сялян паступалі феаладу ў тым аб'ёме, які быў вызначаны апошнім інвентарным апісаннем. Таму дакладнае ўзнаўленне памераў даніны і чыншу па кожнаму населенаму пункту з'яўляецца абавязковым элементам даходнай часткі ўліковых дакументаў. Відавочна, што пры ўсёй сваёй значнасці абедзве групы крыніц, узятыя ізалявана адна ад другой, не могуць служыць падставай для характарыстыкі эканамічных працэсаў у цэлым.

Падобная работа можа быць праведзена толькі праз іх сукупны аналіз. Гэта, несумненна, дасць новыя свежыя зрэзы пры вывучэнні канкрэтнай рэчаіснасці па крыніцах таго ці іншага роду і дапаможа высветліць інфармацыйныя магчымасці кожнай з іх.

Трэба памятаць, што запісы інвентароў, якія насілі нарматыўны характар, і пададзеныя ў кампактнай форме звесткі прыходных артыкулаў лічбаў і сумарыушаў не толькі адлюстроўваюць фактычны бок справы, але і тыражыруюць атрыманую інфармацыю. Апошняя акалічнасць мае вялікае значэнне, таму што ў выпадку дэфектаў інвентароў ці іх страты ёсць крыніцы, якія ўтрымліваюць каштоўны для эканамічнай гісторыі лічбавы матэрыял.

---

[1] Козловский П. Г., Чепко В. В. Инвентари и хозяйственные документы магнатских владений Белоруссии XVI —XVIII в.в. и инвентари помещичьих владений первой половины XIX в. как исторический источник // Ежегодник по



аграрной истории Восточной Европы 1962 г. Мн., 1964; Козловский П. Г. Хозяйственные документы фамильных архивов как источник по аграрной истории Литвы и Белоруссии // Материалы межреспубликанской научной конференции по источниковедению и историографии народов прибалтийских республик Союза ССР: Источниковедение. Вильнюс, 1978.

[2] Копысский З. Ю. Источниковедение аграрной истории Белоруссии. Мн, 1978.

[3] Козловский П. Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. Мн., 1974.

[4] Маньков А. Г. Цены и их движение в Русском государстве XVI в. М.; Л., 1951; Петровская И. Ф. Об изучении поместно-вотчинных архивных фондов XVIII — первой половины XIX в. // Проблемы источниковедения: Сб. статей. Вып. 6. М., 1958; Швейковская Е. Н. Из истории финансово-налоговой системы в России XVII в. // История СССР. 1988. № 5.

[5] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі у Мінску. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 2978. Л. 9.

[6] Там жа. Спр. 1575.

[7] Там жа. Спр. 566. Л. 1.